ЗАКЛЮЧЭННЕ

савета па абароне дысертацый Д 02.21.01 па дысертацыі

Дзінгілеўскай Алены Іванаўны

«Словаўтваральная сінанімія і паранімія прыметнікаў у беларускай літаратурнай мове»

Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.

Дысертацыя Дзінгілеўскай Алены Іванаўны «Словаўтваральная сінанімія і паранімія прыметнікаў у беларускай літаратурнай мове» з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай работай і адпавядае спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова і галіне навук – філалагічныя.

Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці. Упершыню ў беларускім моўназнаўстве даследаваны прыметнікі беларускай літаратурнай мовы, утвораныя суфіксальным спосабам ад адной асновы, з пункту гледжання іх узаемадачыненняў; вызначаны характар семантычных адносін (сінанімічныя, паранімічныя або сінанімічна-паранімічныя) паміж прыметнікамі ў парах і шматкампанентных аб'яднаннях на аснове ацэнкі іх першасных значэнняў; абгрунтавана магчымасць кваліфікацыі элементаў плана зместу лексем як самастойных лексіка-семантычных варыянтаў слова; выяўлена сувязь паміж зыходнымі адносінамі (сінанімічнымі або паранімічнымі) у парах аднаасноўных суфіксальных прыметнікаў і колькасцю другасных значэнняў, а таксама залежнасць захавання або змянення гэтых адносін ад колькасці другасных значэнняў, якія развіваюць складнікі пары; выяўлены і сістэматызаваны спосабы і сродкі дыферэнцыяцыі плана выражэння аднаасноўных суфіксальных ад'ектыўных дэрыватаў, што істотна дапаўняе навуковыя ўяўленні пра словаўтваральны патэнцыял беларускай літаратурнай мовы.

Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень. Савет па абароне дысертацый Д 02.21.01 прысуджае Дзінгілеўскай Алене Іванаўне вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова за:

- вызначэнне ў беларускай літаратурнай мове поўнага корпуса аднаасноўных суфіксальных прыметнікаў, які ўключае 917 пар і 198 шматкампанентных аб'яднанняў вытворных слоў;
- кваліфікацыю семантычных і стылістычных адносін паміж даследаванымі прыметнікамі на падставе ўліку іх першасных значэнняў і ўстанаўленне колькаснага парытэту сінанімічных і паранімічных адносін у парах і трохкампанентных аб'яднаннях, а таксама перавагі змяшаных сінанімічна-паранімічных адносін у астатніх шматкампанентных аб'яднаннях;
- тэарэтычнае абгрунтаванне статусу элементаў семантычнай структуры слова, якія ў тлумачальных слоўніках падаюцца як адценні значэння або як канкрэтызацыя асноўнага значэння, і ўстанаўленне мэтазгоднасці іх кваліфікацыі як самастойных лексіка-семантычных варыянтаў;
- выяўленне перавагі сінанімічных адносін як зыходных у парах аднаасноўных прыметнікаў з аднолькавай колькасцю значэнняў і паранімічных адносін – у парах з рознай іх колькасцю, а таксама ўстанаўленне ролі колькасці другасных значэнняў у захаванні або змяненні зыходных адносін паміж аднаасноўнымі прыметнікамі;
- вызначэнне і сістэматызацыю спосабаў дыферэнцыяцыі плана выражэння аднаасноўных прыметнікаў і распрацоўку на гэтай аснове васьмі мадэлей утварэння сінанімічных і шасці мадэлей утварэння паранімічных аб'яднанняў.

Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.

Навуковыя палажэнні і вывады дысертацыі могуць быць выкарыстаны як тэарэтычная аснова для далейшага даследавання прыметнікаў беларускай літаратурнай мовы і распрацоўкі праблем словаўтваральнай сінаніміі і параніміі. Фактычны матэрыял можа выкарыстоўвацца ў вучэбным працэсе ўстаноў вышэйшай адукацыі пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па лексікалогіі і словаўтварэнні, напісанні курсавых і дыпломных работ, а таксама пры ўкладанні новых слоўнікаў сінонімаў і паронімаў беларускай мовы.

Старшыня савета
па абароне дысертацый В.Д.Старычонак

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый А.В.Чуханова
07.10.2026